# ГУЧЫ, БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА!

Літаратурна-музычная вечарына, прысвечаная Міжнароднаму дню роднай мовы, прайшла ў Полацкім каледжы. Арганізатарам і сцэнарыстам святочнай праграмы па традыцыі выступіла выкладчык беларускай мовы і літаратуры Вера Андрэеўна Аляксеенка – чалавек крэатыўны, нераўнадушны да лёсу беларускай культуры. Быць актыўнымі, дапытлівымі, неабыякавымі Вера Андрэеўна вучыць і сваіх вахаванцаў, прывіваючы павагу да роднага слова, беларускіх традыцый, айчынных дзеячаў мастацтва. Не стаў выключэннем і гэты год.

Літаратурна-музычная вечарына была прысвечана жыццю і творчасці Янкі Купалы. У аснову святочнай праграмы пакладзена драма Уладзіміра Караткевіча «Калыска чатырох чараўніц», якая паказвае нялёгкі лёс нашага славутага паэта. На вечарыне гучала цудоўная беларуская музыка ў выкананні ансамбля «Песняры», кіраўніком якога на працягу многіх гадоў быў Уладзімір Мулявін. 12 студзеня 2016 года яму б споўнілася 75 гадоў.

Вядоўцы праграмы Ганна Вачаева (група 21І) і Руслан Скрыпко (група 21М) расказалі некалькі цікавых фактаў пра тых, хто праславіў нашу Радзіму. Напрыклад, мы даведаліся, што Янка Купала спачатку пісаў свае творы на польскай мове, а Уладзімір Караткевіч – на рускай. Уладзімір Мулявін, уся творчасць якога прасякнута любоўю да Беларусі, нарадзіўся ў Екацерынбургу. Нас, гледачоў і слухачоў вечарыны, кранулі ўзнёслыя радкі: «Гэтыя людзі прыйшлі на зямлю як пасланцы нябёсаў і пакінулі зорны след у вечнасці. Гэтыя людзі адзначаны Богам... час не мае ўлады над іх творчасцю...».



Мы пераканаліся, што такога кшталту святы дапамагаюць навучэнцам першых курсаў прадэманстраваць іх творчыя здольнасці. Незвычайна прывабнымі і артыстычнымі «чараўніцамі» паказалі сябе навучэнкі наступных груп: 11І (Паліна Стаднік, Паліна Мацулевіч, Вольга Лось, Арына Трафімава), 11Н (Кацярына Лявошка, Ксенія Крук, Святлана Макаранка, Кацярына Пятрова), 11В (Марына Акачонак, Анастасія Мацулевіч, Хрысціна Семяніда, Ірына Юковіч). А як натуральна Руслан Скрыпко і Ганна Вачаева сыгралі сцэну развітання Янкі Купалы з маці! Прыгожа і да месца гучала «Мая малітва» на словы Янкі Купалы. Душэўна чыталі вершы на беларускай мове Ірына Факеева (група 31В) і Надзея Дружынская (група 21В). Уразіла таксама тое, як пранікнёна спявалі «Спадчыну» навучэнкі групы 11М. Сумеснае выкананне «Явара і каліны» яшчэ больш згуртавала ўсіх удзельнікаў і гледачоў вечарыны. Завяршылася праграма песняй «Янка Купала».

**Ірына ФАКЕЕВА,**
**удзельніца гуртка**
**«Першыя крокі».**